### *Першы дзень*

#### Заняткі

Задачы: практыкаваць у катанні на веласіпедзе, скачках цераз кароткую скакалку.

Абсталяванне: скакалкі, веласіпеды.

I. Гульня "Сустрэчныя перабежкі".

II. Гонкі на веласіпедзе з перашкодамі: праехаць па вузкай дарожцы паміж двума радамі кубікаў, пад "вароцікамі".

Гульня "Не спацкайся": дзеці па камандзе выхавацеля імкнуцца праехаць па дарожцы, не губляючы раўнавагу, як мага павольней. Скачкі на дзвюх нагах цераз кароткую скакалку, круцячы яе ўперад і назад.

Гульня "Квач".

III. Гульня "Пакажы рукі".

#### Прагулкі

Папасці мячом у абруч, які гойдаецца (адлегласць 3 м). Гульня ў бадмінтон, выкарыстоўваючы ўдары з правага і левага боку. Гульня "Вуда".

Індывідуальная работа: дзеці імкнуцца ўзяць кубік з ракеткі таварыша, не губляючы пры гэтым свой.

### *Другі дзень*

#### Заняткі

Задачы: замацаваць навыкі гульні ў футбол, катання на веласіпедзе.

Абсталяванне: мяч, веласіпеды.

I. Гульня "Каруселі".

II. Гульня ў футбол.

Эстафета на веласіпедах (дыстанцыя 100 м).

III. Прывядзенне інвентару ў парадак.

#### Прагулкі

Ф і з к у л ь т у р н ы я з а б а в ы

Дзеці выходзяць на стартавую пляцоўку і прымаюць удзел у спаборніцтвах, якія арганізуе выхавацель.

1. Ігракі адной каманды адвольна размяшчаюцца на пляцоўцы. Два прадстаўнікі процілеглай каманды (хлопчык і дзяўчынка) становяцца за лініяй пляцоўкі і трымаюць гімнастычны абруч (адзін трымае абруч правай рукой, другі — левай).

Па сігналу тыя, што гуляюць з абручом, выбягаюць уперад і стараюцца надзець яго на іракоў каманды праціўніка. Тыя выкручваюцца, уцякаюць ад іх. Ігрок, на якога надзелі абруч, выбывае з гульні. Гуляюць тры хвіліны, затым каманды мяняюцца ролямі. Выйграе тая каманда, у якой пасля трохвіліннай гульні на пляцоўцы застанецца больш ігракоў.

2. У наступным конкурсе прымаюць удзел толькі дзяўчынкі. Яны строяцца ў калоны. Супраць кожнай калоны ў 10 м ставяць стойкі (крэслы). Вядучыя калон стаяць за рысай з паветранымі шарыкамі ў руках. Па сігналу яны выбягаюць наперад, падбіваючы шарык у паветры, дабягаюць да стойкі і такім жа чынам вяртаюцца назад да сваёй каманды. Наступны ігрок, атрымаўшы шарык, робіць тое ж. Выйграе тая каманда, якая раней закончыць эстафету.

3. Апошняе спаборніцтва, якое называецца "Не сысці з цуркі".

Дзеці становяцца адно супраць аднаго на пастаўленыя цуркі, бяруць абедзвюма рукамі за канцы вяроўку. З воклічамі "Цягні палатно!" цягнуць адно аднаго да сябе, стараючыся саштурхнуць з цуркі. Прайграе той, хто страціць раўнавагу і дакранецца нагой да зямлі.

### *Трэці дзень*

#### Заняткі

Задачы: удасканальваць навыкі скачкоў цераз доўгую скакалку; навыкі вядзення мяча, рухаючыся ўперад.

Абсталяванне: доўгая скакалка, мячы (d = 15 см), кароткія скакалкі.

I. Хадзьба ў калоне па аднаму: пляскание ў далоні на кожны крок; бег у павольным тэмпе.

II. Практыкаванні з кароткай скакалкай:

1. З.с. — стаць, складзеная скакалка ўнізе ў руках. 1 — падняць скакалку ўверх, паглядзець на яе; 2 — апусціць за галавой на плечы; 3 — падняць уверх; 4 — з.с.

2. З.с. — стаць, ногі на шырыні плячэй, скакалка ўнізе ў руках. 1-2 — нахіліцца ўперад, рукі выпрастаць уперад; 3-4 — з.с.

3. З.с. — тое ж. 1-2 — нахіліцца, пакласці скакалку на ногі; 3-4 — выпрастацца, рукі ўверх; 5-6 — нахіліцца, узяць скакалку; 7-8 — з.с.

4. З.с. — стаць, рукі ўнізе. 1-2 — прысесці, калені развесці ў бакі, рукі ўперад; 3-4 — з.с.

5. З.с. — узяць скакалку ў рукі і стаць на яе. 1-2 — выканаць перакат з пятак на наскі.

6. З.с. — стаць, скакалка спераду каля ног. 1-8 — скачкі цераз скакалку на дзвюх нагах; 9-16 — хадзьба на месцы.

Скачкі цераз доўгую скакалку, якую круцяць двое дзяцей. Вядзенне мяча адной рукой па пляцоўцы і закідванне яго ў баскетбольны кошык.

Гульня "Мышалоўка".

Гульня "Лянок".

#### Прагулкі

Вісы на высокай перакладзіне турніка, паперамена згінаючы і выпростваючы ногі.

Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Рухомая гульня "Шышкі, жалуды, арэхі".

### *Чацвёрты дзень*

#### Заняткі

Задачы: удасканальваць навыкі скачкоў цераз доўгую скакалку; навыкі лоўлі мяча.

Абсталяванне: бервяно, доўгая скакалка, мячы.

I. Хадзьба прама і бокам уперад па гарызантальнаму бервяну, саскокванне з яго.

II. Практыкаванні з мячом: кінуць мяч уперад, дагнаць яго; стукнуць мячом аб сцяну, злавіць яго пасля адскоку. Скачкі цераз доўгую скакалку адвольным спосабам.

Гульня "Гарлачык".

III. Гульня "Лянок".

#### Прагулкі

Гульня ў бадмінтон па спрошчаных правілах. Лажанне па шасту, вісы на высокай і нізкай перакладзіне турніка.

Гульні "Мядзведзь і пчолы", "Белыя мядзведзі".

### *Пяты дзень*

#### Заняткі

Задачы: вучыць хадзьбе па вузкай рэйцы гімнастычнай лаўкі.

Абсталяванне: гімнастычныя лаўкі, мяшочкі з пяском, шышкі.

I. Хадзьба гімнастычным крокам, бег, скачкі з нагі на нагу, рухаючыся ўперад, хадзьба ўрассыпную, пастраенне ў круг.

II. Практыкаванні выконваюцца лежачы на падлозе:

1. З.с. — лёгчы на падлогу, рукі ўздоўж тулава. 1 — падняць рукі ўперад; 2 — рукі ўверх, палажыць іх на падлогу за галавой; 3 — рукі ўперад; 4 — з.с.

2. З.с. — лёгчы на падлогу, рукі за галавой. 1 — падняць правую руку і левую нагу ўперад; 2 — з.с.

3. З.с. — рукі пад падбародкам. 1 — узяцца рукамі за ногі; 2 — з.с.

4. З.с. — лёгчы на жывот, рукі выпрастаць уверх. 1-2 — перакаціцца на бок, а потым на спіну; 3-4 — адваротнае дзеянне.

5. З.с. — сесці, ногі скрыжаваць. 1-2 — падняцца без дапамогі рук.

Хадзьба прама і бокам уперад па гімнастычнай лаўцы па вузкім яе баку.

Поўзанне па падлозе па-пластунску з элементамі спаборніцтва.

Гульня "Жывёла і пастка".

III. Гульня "Маўчанка".

#### Прагулкі

Вядзенне мяча правай і левай рукой, закідванне яго ў баскетбольны кошык.

Гульня "Гарлачык". Катанне на веласіпедзе.


ТЭАТР-СТУДЫЯ "БАТЛЕЙКА"

[illegible]

Кошт камплекта — 7 000 рублёў.

[illegible]

п'ес. шматфункцыянальная [illegible] трансфармуецца для тэатра [illegible] марыянетак, ценявога і насто[illegible] раў.

Кошт камплекта — 11 800 рублёў.

[illegible]